НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА

21 ліпеня 2023 г.

# Слухайце інтуіцыю

Усям'і Дзмітрыя Бурака, выпускніка аграмеханічнага факультэта БДАТУ, і бацька, і дзядулі маюць тэхнічную адукацыю. Натуральна, і Дзіма пасля 9 класа захацеу атрымаць тэхнічную прафесію. Побач з родным горадам Баранавічы быў Навамышскі дзяржаўны аграрны каледж, дзе можна было набыць кваліфікацыю "аўтаслесар-трактарыст-вадзіцель катэгорыі “С". Слова "трактарыст” назве прафесіі юнак праігнараваў, але, як аказалася, дарма.

Прафесія трактарыста так захапіла, што ён далей пайшоў вучыцца на тэхніка-механіка у Лунінецкі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж сельскагаспадарчай вытворчасці, які скончыў у 2017 годзе. Балаў крыху не хапіла да дыплома з адзнакай, але затое удалося паудзельнічаць у беларускім WorldSkills і нават стаць пераможцам раённага конкурсу прафесійнага майстэрства.

У 2016 годзе Дзіма прыязджаў на конкурс "Аграмайстэрства" у Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны універсітэт, дзе яму неверагодна спадабалася. Тут было ўсё і адразу: тэхнічная прафесія на аграмеханічным факультэце, сапраўдныя трактары ў вучэбных аўдыторыях, выдатны інтэрнат. Пасля каледжа малады чалавек узяў мэтавае накіраванне, бо пасля вучобы хацеў вярнуцца дадому, і паступіў у БДАТУ.

Скончыўшы універсітэт, Д.Бурак быў прызваны на тэрміновую ваенную службу. Яе ён праходзіў у Брэсцкай Чырванасцяжнай пагранічнай групе на тэрыторыі былой легендарнай 9-й заставы. Пасля арміі Дзмітрый вярнуўся дадому, як і планаваў перад паступленнем ва універсітэт. Зараз працуе інжынерам па працаемкіх працэсах у ТАА "СталовічыАгра" Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Да таго ж Дзмітрый вучыцца у магістратуры БДАТУ на завочным аддзяленні па спецыяльнасці "Тэхнічнае забеспячэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі". Тэма яго магістарскай дысертацыі —"Узаемадзеянне рухавікоў машын з глебай і аналіз паказчыкаў у сістэме". Дарэчы, у магістранта кафедры эксплуатацыі машынна-трактарнага парка і агратэхналогій 14 надрукаваных работ і хутка яшчэ тры пабачаць свет.

На пытанне, што б ён параіў учарашнім школьнікам, Дзмітрый адказаў так:

— Па-першае, выбіраць будучую прафесію, не арыентуючыся на моду, а абапіраючыся на ўласнае разуменне і інтуіцыю. Па-другое, памятаць, што студэнцтва — унікальны час, і важна не растраціць яго дарма, а наадварот, набыць як мага больш ведаў і ўражанняў. Па-трэцяе, не баяцца спрабаваць нешта новае, заўсёды рухацца наперад. Па-чацвёртае, вашы таварышы па групе — гэта першыя дарослыя сябры.

- Па-пятае, жыць пад сонцам і дажджом з любоўю да сваіх блізкіх і роднай зямлі!

**Таццяна НЯПАРКА,**
**Алена ПАДАШЭЎСКАЯ.**